НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# Ф. І. ШМІДАЎ

## (ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

Калектыў Гомельскага універсітэта адзначае 60-годдзе з дня нараджэння загадчыка кафедры матэматычнага аналізу Фёдара Ісакавіча Шмідава.

Ф. І. Шмідаў нарадзіўся 22(9) красавіка 1911 года ў вёсцы Іскань паблізу Журавіч, у сям'і рабочага-адбойшчыка сярпоў. З 1928 года пачаўся працоўны шлях Фёдара Ісакавіча. Рознымі прафесіямі аваладаў юнак — слясарнічаў, стаў токарам. Пасля заканчэння сярэдняй школы Ф. І. Шмідаў працягваў вучобу на механіка-матэматычным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў у 1934 годзе. Малады спецыяліст цалкам прысвяціў сябе вывучэнню матэматыкі. Ён паступае ў аспірантуру МДУ і свой далейшы шлях у навуцы робіць пад кіраўніцтвам буйнейшага матэматыка Андрэя Мікалаевіча Калмагорава. У 1938 годзе Фёдар Ісакавіч паспяхова абараняе дысертацыю і становіцца кандыдатам фізіка-матэматычных навук. З гэтага часу ён працуе дацэнтам у інстытутах Масквы.

Амаль тры дзесяцігоддзі навуковая дзейнасць Ф. І. Шмідава звязана з Гомелем. Адразу ж пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ён пераязджае на радзіму і становіцца дэканам фізіка-матэматычнага факультэта Гомельскага педагагічнага інстытута і загадчыкам кафедры вышэйшай матэматыкі.

За час работы ў Гомелі Фёдар Ісакавіч выхаваў многа маладых спецыялістаў. У большасці школ Гомельшчыны фізіку і матэматыку выкладаюць яго былыя вучні. Многія з іх працуюць побач з Фёдарам Ісакавічам у нашым універсітэце. Гэта В. Батаеў, А. Бекарэвіч, С. Буракоўская, С. Вядзюн, Н. Глыбін, Н. Ялецкі, Т. Жалонкіна, А. Макарава, Г. Міцкевіч, І. Палій, Н. Пакаташкіна, А. Рамаоўскі і іншыя. Некаторыя з выхаванцаў Фёдара Ісакавіча працуюць у многіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі.

Многае зрабіў Фёдар Ісакавіч для арганізацыі матэматычнай адукацыі ў Гомельскім педінстытуце, а ў апошнія два гады — нашым універсітэце. Выкладанне матэматычных дысцыплін вядзецца ім на сучасным навуковым узроўні.

Ф. І. Шмідаў многа ўвагі ўзяляе рабоце са здольнымі школьнікамі. Пад яго кіраўніцтвам вось ужо восьмы год працуе юнацкая матэматычная школа пры нашай ВНУ. Выпускнікі ЮМШ штогод працягваюць вучобу ў лепшых інстытутах краіны. Настаўнікі школ Гомельшчыны часта звяртаюцца да Фёдара Ісакавіча за метадычнай дапамогай і заўсёды атрымліваюць яе.

Больш 40 год Ф. І. Шмідаў вядзе актыўную навуковую дзейнасць. Толькі за апошнія дзесяць год ён апублікаваў больш 25 прац. Яго даследаванні якасцей вымяральных функцый адной і многіх пераменных заслужылі шырокае прызнанне ў нашай краіне і за мяжой. Вынікі гэтых даследаванняў пакладзены ў аснову доктарскай дысертацыі.

У перыяд станаўлення нашага універсітэта Фёдар Ісакавіч арганізаваў работу кафедры матэматычнага аналізу, так каб забяспечыць вучэбны працэс, нягледзячы на недахоп кадраў.

У дзень 60-годдзя калегі і вучні Фёдара Ісакавіча горача віншуюць юбіляра, жадаюць яму моцнага здароўя, творчага настрою і поспехаў у выхаванні маладых спецыялістаў.

**А. ЮШЧАНКА,**
**дэкан механіка-матэматычнага факультэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

**Н. ЯЛЕЦКІ,**
**сакратар партбюро факультэта, старшы выкладчык.**

**Г. ФРЫДМАН,**
**старшыня прафбюро факультэта, дацэнт.**



# ДВА ДНІ Ў КІЕВЕ

Прайдзіцеся шырокімі вуліцамі і плошчамі, зірніце з высокай кручы на вялікую раку, удыхніце поўнымі грудзьмі водыр бульвараў і садоў, і мы спадзяемся, гавораць кіяўляне, што вы скажаце не адно добрае слова пра наш цудоўны горад.

У праваце гэтых слоў мы, група студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта, пераканаліся ледзь ступілі на гасцінную ўкраінскую зямлю. Кіеў сустрэў нас добрым надвор'ем, пяшчотным красавіцкім сонцам і шчырымі прывітальнымі ўсмешкамі яго жыхароў.

Два дні знаёміліся мы з украінскай сталіцай, яе славутасцямі, а здаецца, што гэты час праляцеў як адна мінута.

Крашчацік — сэрца старажытнага горада, вуліца з цудоўнымі будынкамі, прыгожымі алеямі, і кожны, хто ступае на яе брук, здаецца, адчувае подых гісторыі. Усё помніць Крашчацік: і кроў рэвалюцыі, і шчасце мірнай працы, фашыскую навалу, і радасць аднаўлення. Асабліва цудоўны Крашчацік сёння, у цёплыя красавіцкія дні, у пяшчотнай зеляніне. Нездарма гавораць, што Кіеў самы зялёны горад краіны.

Ідзем далей по гораду. Універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі. Яго будынак — помнік архітэктуры. Кіеўскі універсітэт — цэнтр украінскай культуры. У гэтым сапраўдным горадзе навукі навучаецца 20 тысяч студэнтаў.

З хваляваннем знаёміліся мы, студэнты ГДУ, з украінскай сталіцай, з яе музеямі і тэатрамі, архітэктурай і спартыўнымі збудаваннямі. Каго не ўсхвалюе расказ экскурсавода аб цэнтральным стадыёне. Яго адкрыццё намячалася на 22 чэрвеня 1941 года. У гэты дзень на мірны горад былі скінуты фашысцкія бомбы. На пяць год было перанесена адкрыццё стадыёна. Як непахісную веру ў нашу перамогу захавалі многія кіяўляне ўваходныя білеты на стадыён. Іх горача віталі гледачы ў дзень другога адкрыцця спартыўнай базы. Людзі апладыравалі чалавечай вернасці.

У Кіеве ёсць месцы, звязаныя з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. На ціхай вуліцы Ульянавых ёсць невялікі домік. Тут напярэдадні першай рускай рэвалюцыі жылі маці і сёстры правадыра. У гэты ж час у горадзе знаходзіўся і малодшы брат Дзмітрый Ільіч.

Ва ўкраінскай сталіцы захавалася многа старажытных помнікаў — сведкаў высокага майстэрства рускіх зодчых. З вялікай цікавасцю знаёміліся мы з Сафійскім саборам, Кіева—Пячэрскай лаўрай і іншымі славутасцямі горада.

Парк Вечнай славы... Свята ўшаноўвае народ памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за гонар, свабоду і незалежнасць роднай Айчыны. З глыбокім хваляваннем у маўчанні стаялі мы ля помніка Невядомаму салдату. Велічны манумент з цёмна-шэрага граніту ўзняўся ў блакітнае неба на 26 метраў, а ля яго п'едэстала гарыць незгасальны агонь, які гаворыць аб чалавечай адданасці абаронцам нашай Радзімы.

У час двухдзённай экскурсіі мы наведалі Акадэмічны тэатр оперы і балету Украінскай ССР, дзе слухалі оперу французскага кампазітара Шарля Гуно «Фауст».

Здаецца, вельмі кароткім было наша знаёмства са старажытнай украінскай сталіцай, але назаўсёды ў нашых



сэрцах застанецца любоў да гэтага горада, яго людзей, яго культуры. Мы не забудзем сустрэчу з Кіевам, горадам-героем, гордасцю савецкай краіны.

НА МАЛЮНКАХ помнік Тарасу Рыгоравічу Шаўчэнку перад Кіеўскім універсітэтам. Унізе — ля магілы Невядомага салдата.

**Р. НЯМЦОЎ,**
**студэнт 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

Малюнкі зроблены студэнтам 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандрам Якаўлевым.



# ТВАЯ ПАМЯЦЬ

Днямі ў чытальнай зале інтэрната універсітэта адбыўся тэматычны вечар «Якая ў вас памяць?», падрыхтаваны кафедрай педагогікі і псіхалогіі. Яго адкрыла дацэнт К. А. Камісарчык. Яна расказала, што ў наш век вялізнай плыні інфармацыі асабліва хвалюючай становіцца праблема памяці. Задача псіхалогіі, якая знаходзіцца на мяжы навук, —даць магчымасць чалавеку кіраваць сваёй памяццю.

Актыўны ўдзел у гэтым цікавым мерапрыемстве прынялі студэнты гісторыка-філалагічнага і факультэта фізічнага выхавання. Змястоўныя паведамленні зрабілі студэнты В. Лазавікоў, Н. Данілава, М. Рухля, А. Кавязіна.

Настаўніца гісторыі сярэдняй школы № 11 Н. Амбрузава зрабіла даклад «Як псіхалогія дапамагае мне ў рабоце». Яе выступленне суправаджалася захапляючымі эксперыментамі, якія зрабілі тэматычны вечар больш змястоўным і цікавым.

**Н. ГРЫГОР'ЕЎ.**

# НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ Ў БІБЛІЯТЭКУ УНІВЕРСІТЭТА

### ФІЛАСОФІЯ. ПСІХАЛОГІЯ

Адамар Жак. Исследование психологии процесса изобретения в области математики. М., «Сов. радио», 1970.

Брушлинский А. В. Психология мышления и кибернетика. М., «Мысль», 1970.

Голованов В. Н. Законы в системе научного знания. М., «Мысль», 1970.

Ковалёв С. М. О человеке, его порабощении и освобождении. М., Политиздат, 1970.

Ленинизм живет и побеждает (Сборник статей по вопросам марксистско-ленинского учения), М., Политиздат, 1970.

Научное управление обществом. Вып. 4. Под ред. профессора В. Г. Афанасьева, М., «Мысль», 1970.

Павлов Т. К диалектическому единству дарвинизма и генетики. Лекция. М., «Прогресс», 1970.

Против буржуазных фальсификаторов истории и политики КПСС. М., Политиздат, 1970.

Современные проблемы теории познания диалектического материализма. т. 2., Истина, познание, логика, М., «Мысль», 1970.

Хэнзел. Парапсихология. Перевод с английского Ф. В. Широкова. М., Мир, 1970.

Шкатулин А. П. Философия марксизма-ленинизма. М., Политиздат, 1970.

### ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

Аваков Р. и Гаврилюк В. «Похищение умов», М., «Наука», 1970.

Амелин П. П. Интеллигенция и социализм, Л., ЛГУ, 1970.

Бак Т. Влияние В. И. Ленина и ленинизма на развитие коммунистической партии Канады., М., Политиздат, 1970.

Белов Г. А. Политические отношения в социалистическом обществе. М., Издательство МГУ, 1970.

Борьба В. И. Ленина и Коммунистической партии Советского Союза против троцкизма. М., Политиздат, 1970.

Внешняя политика Советского Союза и международные отношения. Сборник документов. 1969 год. М., «Международные отношения», 1970.

Галлени Мауро. Советские партизаны в итальянском движении сопротивления. Перевод с итальянского. М., «Прогресс», 1970.

Голинков Д. Л. Крах вражеского подполья (из истории борьбы с контрреволюцией в Советской России в 1917—1924 гг.). М., Политиздат, 1971.

Гольдберг Д. И., В. И. Ленин и Япония., Л., 1970.

Ленинская «Искра». К семидесятилетию со дня выхода первого номера. М., Политиздат, 1970.

Основы законодательства Союза СССР и союзных республик о труде. М., 1970.

Петровский Г. И. Наш мудрый вождь (Воспоминания о В. И. Ленине). М., Политиздат, 1970.

Против буржуазных фальсификаторов истории и политики КПСС. Сост. и авт. предисл. В. М. Шапко. М., Политиздат, 1970.

